ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 19 (258) | Субота, 28 мая 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПЛЕНУМ ЦК КПСС

24 мая 1977 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пленум заслухаў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС, старшыні Канстытуцыйнай камісіі таварыша Брэжнева Л. І. «Аб праекце Канстытуцыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Пленум ЦК прыняў па гэтаму пытанню пастанову, якая апублікавана ў друку.

Пленум ЦК КПСС заслухаў паведамленне члена Палітбюро ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС тав. Суслава М. А. «Аб Дзяржаўным гімне СССР». Пленум адобрыў тэкст і музычную рэдакцыю Дзяржаўнага гімна СССР і перадаў гэта пытанне на разгляд Вярхоўнага Савета СССР.

Пленум ЦК КПСС разгледзеў таксама арганізацыйныя пытанні.

Пленум вызваліў тав. Падгорнага М. В. ад абавязкаў члена Палітбюро ЦК КПСС.

Пленум выбраў сакратаром ЦК КПСС тав. Русакова К. В.

Пленум вызваліў тав. Катушава К. Ф. ад абавязкаў сакратара ЦК КПСС у сувязі з пераходам яго на работу ў Савет Эканамічнай Узаемадапамогі.

На гэтым Пленум ЦК закончыў сваю работу.

# ЗНАЁМЦЕСЯ З НАШЫМІ КАНДЫДАТАМІ Ў ДЭПУТАТЫ

## КРАСНАГІР

### Людміла Канстанцінаўна

**студэнтка другога курса эканамічнага факультэта — кандыдат у дэпутаты Гомельскага абласнога Савета па Фурманаўскай выбарчай акрузе № 16.**



КРАСНАГІР Людміла Канстанцінаўна нарадзілася ў 1958 годзе. Беларуска. Член ВЛКСМ.

У 1975 годзе закончыла з залатым медалём Гомельскую СШ № 20. У тым жа годзе паступіла на эканамічны факультэт ГДУ.

Тав. Краснагір Л. К. з'яўляецца здольнай і добрасумленнай студэнткай. Яна вучыцца на «выдатна», прымае актыўны ўдзел у рабоце студэнцкага навуковага таварыства ўніверсітэта, у арганізацыі культурна-масавых мерапрыемстваў факультэта, у конкурсах мастацкай самадзейнасці.

У 1976 годзе была байцом студэнцкага будаўнічага атрада. Праявіла здольнасці арганізатара ў грамадскай рабоце.

Краснагір Л. К. выбіралася сакратаром камсамольскага бюро групы, членам курсавога бюро, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта і ўніверсітэта.

За выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць Краснагір Л. К. неаднаразова заахвочвалася адміністрацыяй і грамадскімі арганізацыямі факультэта.

Краснагір Людміла Канстанцінаўна — дастойны кандыдат у дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

## ШАМЯТКОЎ

### Леанід Аляксандравіч

**прарэктар па вучэбнай рабоце — кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета па выбарчай акрузе № 203.**



ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч нарадзіўся ў 1937 годзе ў Гомелі. Беларус. Член КПСС з 1973 года.

Шамяткоў Л. А. закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава і аспірантуру пры кафедры вышэйшай матэматыкі. У 1964 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук, а ў 1969 — доктара фізіка-матэматычных навук. Працаваў у Гомельскай лабараторыі канечных груп Інстытута матэматыкі АН БССР спачатку малодшым, а затым старшым навуковым супрацоўнікам. У 1976 годзе назначаны прарэктарам па вучэбнай рабоце ГДУ.

Шамяткоў Л. А. з'яўляецца буйным савецкім вучоным-алгебраістам, мае звыш сарака друкаваных навуковых прац, якія атрымалі высокую адзнаку не толькі ў нашай краіне, але і замежных матэматыкаў.

Шамяткоў Л. А. кіруе падрыхтоўкай аспірантаў па дзвюх спецыяльнасцях. Пяць яго вучняў ужо абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Шамяткоў Леанід Аляксандравіч — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета.

## БАРАНОЎСКАЯ

### Антаніна Дзмітрыеўна

**студэнтка трэцяга курса гісторыка-філалагічнага факультэта — кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета па выбарчай акрузе № 204.**



БАРАНОЎСКАЯ Антаніна Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1956 годзе. Беларуска. Член ВЛКСМ.

Пасля заканчэння сярэдняй школы працавала старшай важатай Маладушскай СШ Рэчыцкага раёна. У 1974 годзе паступіла на гісторыка-філалагічны факультэт (аддзяленне беларускай і рускай моў і літаратур).

Бараноўская А. Д. за час вучобы ва ўніверсітэце зарэкамендавала сябе толькі са станоўчага боку. Вучыцца на «добра» і «выдатна». Вучобу паспяхова сумяшчае з грамадскай дзейнасцю, якую вядзе і ў студэнцкай групе, і на факультэце. З'яўляецца камсоргам групы, актыўна ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці. Пастаянна павышае свой ідэйна-палітычны ўзровень. Карыстаецца павагай сярод студэнцкай моладзі і выкладчыкаў факультэта за сваю сціпласць, чуласць і ветлівасць, пастаянную гатоўнасць аказаць дапамогу таварышам.

Бараноўская Антаніна Дзмітрыеўна — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета.

## СКРЫННІКАЎ

### Міхаіл Іванавіч

**намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкома — кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета па выбарчай акрузе № 205.**



СКРЫННІКАЎ Міхаіл Іванавіч нарадзіўся ў 1936 г. у в. Кірава, Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Беларус. Член КПСС з 1962 года.

З 1955 па 1958 год служыў у радах Савецкай Арміі, затым вучыўся ў Гомельскім педагагічным інстытуце імя В. П. Чкалава. З 1961 па 1965 год тав. Скрыннікаў М. І. працаваў сакратаром камітэта камсамола інстытута. Наступныя чатыры гады ён быў інструктарам, а з 1969 па 1973 год загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі гаркома КПБ. Са жніўня 1973 года працуе намеснікам старшыні Гомельскага гарвыканкома.

За час работы ў партыйных і савецкіх органах тав. Скрыннікаў зарэкамендаваў сябе ўдумлівым, ініцыятыўным і добрасумленным работнікам, добрым арганізатарам. У рашэнні пытанняў праяўляе прынцыповасць і настойлівасць.

З'яўляецца членам гаркома КПБ. Узнагароджаны медалем «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Скрыннікаў Міхаіл Іванавіч — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета.

## ЧЫНДАРАЎ

### Пётр Пятровіч

**студэнт 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта — кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета па выбарчай акрузе № 206**



ЧЫНДАРАЎ Пётр Пятровіч нарадзіўся ў 1952 годзе ў г. Гомелі. Беларус. Член ВЛКСМ.

Пасля заканчэння школы працаваў наладчыкам на Гомельскай фабрыцы «8 Сакавіка». Служыў у радах Савецкай Арміі, дзе закончыў вячэрнюю партыйную школу. Пасля звальнення ў запас паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне ГДУ, па заканчэнню якога быў залічаны студэнтам гістарычнага аддзялення.

За час вучобы ва ўніверсітэце тав. Чындараў П. П. зарэкамендаваў сябе толькі з добрага боку. Вучыцца на «добра» і «выдатна», уважлівы і чулы да таварышаў. Вучэбную работу паспяхова спалучае з грамадскай, з'яўляецца старшынёй прафсаюзнага бюро факультэта.

Да ўсіх грамадскіх даручэнняў тав. Чындараў П. П. адносіцца з пачуццём высокай адказнасці. Карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод студэнтаў і выкладчыкаў.

Чындараў Пётр Пятровіч — дастойны кандыдат у дэпутаты гарадскога Савета.

# У ФОНД ФЕСТЫВАЛЮ

Летам 1978 года ў Гаване, сталіцы сацыялістычнай Кубы, адбудзецца XI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Ён заклікаемы пацвердзіць жыццёвую сілу сусветнага фестывальнага руху, яго непарыўную сувязь з барацьбой шырокіх грамадскіх сіл за мір, міжнародную бяспеку, дэмакратыю і грамадскі прагрэс.

Ленінскі камсамол праводзіць вялікую арганізацыйную і маса-палітычную работу па падрыхтоўцы да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

У краіне ўсё шырэй разгортваецца спаборніцтва за права прадставіць савецкую моладзь на фестывалі ў Гаване. Многія камсамольскія арганізацыі Масквы, Ленінграда, Украіны, Узбекістана, Малдавіі, Валгаградскай, Арэнбургскай, Яраслаўскай, раду іншых рэспублік і абласцей выступілі з ініцыятывай аб арганізацыі камсамольска-маладзёжных суботнікаў у фонд фестывалю

**VII пленум ЦК ВЛКСМ прыняў рашэнне правесці 25 чэрвеня 1977 года, напярэдадні Дня савецкай моладзі, Усесаюзны камсамольска-маладзёжны суботнік, заработаныя сродкі ад якога пералічыць у фонд фестывалю.**

Дзень 25 чэрвеня павінен стаць яркім працоўным святам Ленінскага камсамола, савецкай моладзі, праяўленнем іх вернасці прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізму, уклада кожнага маладога чалавека краіны Саветаў у падрыхтоўку XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў на Кубе.

**Абавязак кожнага камсамольца — азнаменаваць яго высокапрадукцыйнай, ударнай, камуністычнай працай.**

Для падрыхтоўкі і правядзення суботніка ў рэспубліканскіх, краявых, абласных, акруговых, гарадскіх, раённых і пярвічных камсамольскіх арганізацыях рэкамендавана стварыць штабы з удзелам прадстаўнікоў савецкіх і прафсаюзных органаў і гаспадарчых арганізацый, перадавікоў сацыялістычнага спаборніцтва.

Камітэтам камсамола сумесна з мясцовымі органамі і гаспадарчымі кіраўнікамі неабходна прыняць неабходныя меры да актыўнага ўдзелу ў суботніку ўсіх юнакоў і дзяўчат.

*Дзень адкрытых дзвярэй ва ўніверсітэце*

# ПЕРАД ВЫБАРАМ ДАРОГІ Ў ЖЫЦЦЁ

Для выпускнікоў сярэдніх школ празвінеў апошні званок. Праз тры дні ў іх пачнуцца выпускныя экзамены. Гэта апошні рубеж перад выбарам дарогі ў самастойнае жыццё. І ўжо цяпер рабят усё больш і больш хвалюе адно і тое ж пытанне: куды пайсці вучыцца далей, дзе выбраць сваё месца, каб яно заўсёды прыносіла радасць і маральнае задавальненне? Для многіх школьнікаў яно вырашаецца ў час традыцыйных адкрытых дзвярэй вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Дзень адкрытых дзвярэй штогод праводзіцца і ў нашым універсітэце. Выпускнікі школ горада і бліжэйшых раёнаў Гомельшчыны мелі магчымасць падрабязна азнаёміцца з ім у мінулую нядзелю. На гэта запрашалі іх паўсюдна вывешаныя афішы.

Актавая зала ГДУ гасцінна сустрэла будучых абітурыентаў. З уступным словам да іх звярнуўся прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Л. А. Шамяткоў. Ён пазнаёміў рабят з прысутнымі дэканамі факультэтаў, загадчыкамі кафедр і выкладчыкамі, расказаў пра спецыяльнасці і спецыялізацыі ўніверсітэта, коратка асвяціў некаторыя пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу, адказаў на зададзеныя пытанні.

Затым разам з дэканамі рабяты разышліся па выбраных факультэтах, дзе яны змаглі больш падрабязна азнаёміцца з той спецыяльнасцю, якую вырашылі набыць. Юнакі і дзяўчаты з цікавасцю аглядалі вучэбныя аўдыторыі і лабараторыі, многае даведаліся пра шматграннае студэнцкае жыццё.

Дзень адкрытых дзвярэй закончыўся канцэртам, з якім выступілі перад гасцямі самадзейныя артысты ўніверсітэта.

У час гэтых сустрэч ад многіх рабят можна было пачуць тое, што яны цвёрда вырашылі паступаць на вучобу ў наш універсітэт.



Вялікую работу са студэнтамі-завочнікамі біялагічнага аддзялення праводзіць загадчык кафедры заалогіі і дарвінізму прафесар Б. П. САВІЦКІ, якога вы бачыце ў час гутаркі з завочнікамі.

Фота А. Карніенкі.

## КОНКУРС на лепшага перакладчыка

Ва ўніверсітэце ўжо стала добрый традыцыяй праводзіць вечары на англійскай мове і конкурсы на лепшы пераклад навукова-папулярнага тэксту. Яны дапамагаюць студэнтам выкарыстоўваць на практыцы веды і навыкі, набытыя ў працэсе вывучэння англійскай мовы і ўбачыць вынікі сваёй працы.

**Нядаўна праходзіў чарговы конкурс на лепшы пераклад навукова-папулярнага тэксту. Ён прысвячаўся 60-годдзю Вялікага Кастрычніка і праводзіўся ў два туры. Мэта першага тура конкурсу — выбраць на кожным факультэце лепшых перакладчыкаў англійскага тэксту на рускую мову для ўдзелу ў агульнаўніверсітэцкім конкурсе.**

Пераможцамі 1-га тура сталі студэнты У. Літвінаў, А. Разенбаум, А. Басін, Д. Федаровіч, С. Савіч, Л. Ціханенка, Я. Броўкін. Усе яны прадэманстравалі добрыя веды англійскай мовы, уменне дакладна перадаць змест англійскага артыкула.

Лепшымі прызнаны пераклады У. Літвінава (гісторыка-філалагічны факультэт), А. Разенбаума (фізічны факультэт), А. Басіна (механіка-матэматычны факультэт). Журы конкурсу прысудзіла ім адпаведна 1, 2, 3 месцы. Пераможцы будуць узнагароджаны граматамі камітэта камсамола ўніверсітэта.

Кафедра англійскай мовы жадае ўсім удзельнікам конкурсу далейшых поспехаў у аваладванні замежнай мовай.

**С. МАКРАВУСАВА,**
**старшыня журы конкурсу,**
**выкладчыца кафедры**
**англійскай мовы.**

## ЦІКАВЫ КАНЦЭРТ

Сёння імя выдатнага акцёра, рэжысёра і пісьменніка Васіля Шукшына добра вядома аматарам мастацтва. Напісаныя ім творы, пастаўленыя мастацкія фільмы знайшлі вялікае прызнанне ў прыхільнікаў яго шматграннага таленту.

Шмат іх і ў нашым універсітэце. Днямі ў актавай зале ГДУ адбыўся літаратурны вечар, на якім апавяданні В. Шукшына студэнтам і выкладчыкам ГДУ чытаў лаўрэат Усерасійскага конкурсу артыстаў эстрады М. В. Фёдараў. Ён пазнаёміў прысутных з творчай дзейнасцю пісьменніка, прачытаў яго лепшыя творы.

Удзячныя слухачы гарачымі апладысментамі дзякавалі артысту, уручылі яму кветкі.

**УМЕЙЦЕ АДПАЧЫЦЬ**

# МНОЖЫМ ЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ

У адзін з майскіх выхадных дзён на рачную прыстань г. Гомеля пачалі збірацца юнакі і дзяўчаты. Усе яны выглядалі як бывалыя турысты: рукзакі за плячыма, гітары, палаткі. Настрой ва ўсіх бадзёры, прыўзняты. Гэта 270 студэнтаў эканамічнага факультэта вырашылі правесці «майскія дні эканаміста» на ўлонні прыроды, ва ўрочышчы Старыя Чонкі.

Да правядзення новага і карыснага мерапрыемства на факультэце рыхтаваліся старанна. Добрая арганізацыя адпачынку будучых эканамістаў заўсёды не выходзіла з-пад увагі выкладчыкаў факультэта. І вось было вырашана: устанавіць яшчэ адну добрую традыцыю— праводзіць вольны час на ўлонні прыроды ў цікавых і захапляльных спартыўных спаборніцтвах, з гітарай і песняй ля кастра. З вялікім энтузіязмам падхапілі гэту прапанову камсамольскія актывісты, якія тут жа ўзяліся за справу. У арганізацыі «майскіх дзён эканаміста» ім аказалі вялікую дапамогу дэкан факультэта І. П. Трацэўскі, сакратар партбюро Н. В. Волкава, намеснік дэкана па спорту П. П. Саковіч, выкладчыкі Э. В. Зубкоў, Г. П. Куцэнка, А. В. Нявераў, В. А. Харытошкін.

Нарэшце, доўгачаканы дзень настаў. Цеплаход даставіў усіх удзельнікаў свята да месца распалажэння. Адразу ж пасля арганізацыйных мерапрыемстваў (установка палатак, разбіўка лагера) пачаліся спартыўныя спаборніцтвы па самых розных відах спорту (валейбол, міні-футбол, тэніс, бадмінтон і нават футбол паміж дзяўчатамі!). Члены рэдкалегій курсаў і груп таксама прыняліся за работу, а спецыяльны атрад дружыны пачаў несці сваю службу. Затым усе сабраліся ля кастра, дзе праводзіліся гульні, танцы. Сумаваць нікому не давялося.

На наступны дзень, набраўшыся сіл, студэнты зноў уключыліся ў спартыўную барацьбу. Праводзілася эстафета, памераліся сілай у перацягванні каната каманды курсаў.

Непрыкметна праляцеў час і трэба было вяртацца назад. Усе без выключэння засталіся вельмі задаволенымі праведзеным мерапрыемствам.

Сваімі ўражаннямі дзеляцца некаторыя яго ўдзельнікі:

**С. Анісімаў, студэнт групы Т-34:** Было ўсё: касцёр і танцы, спартыўная праграма і адпачынак. Ад «майскіх дзён эканаміста» засталіся выдатныя ўспаміны. Няхай яны стануць яшчэ адной добрай традыцыяй факультэта.

**В. Ермакоў, студэнт групы Т-12:** Вясной у мяне заўсёды выдатны настрой, але асаблівым ён быў у час правядзення «майскіх дзён эканаміста». Жаданне адно: такіх мерапрыемстваў трэба арганізоўваць больш.

Новае пачынанне на нашым факультэце з'явілася асновай правільнай арганізацыі культурнага адпачынку студэнтаў у летні перыяд. Добра прадуманая арганізацыя, актыўны ўдзел студэнтаў 1-га і 4-га курсаў дазволілі зрабіць свята эканамістаў самым лепшым святам года. Яно папоўніць нашы традыцыі.

**А. СЕНІН,**
**сакратар бюро ЛКСМБ**
**эканамічнага факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ: на месцы адпачынку студэнтаў і іх выкладчыкаў хутка вырас палатачны гарадок.**

Фота А. Мажарава.

## КАШТОЎНАЕ ВЫДАННЕ

Нядаўна выйшла ў свет кніга «Інвентары магнацкіх уладанняў Беларусі XVII—XVIII стагоддзяў. Уладанне Смаргонь». Інвентары ўяўляюць гаспадарчыя вопісы феадальных уладанняў. Яны служылі для вызначэння становішча феадальна залежнага насельніцтва і рэгулявання ўзаемаадносін паміж уласнікам, арэндатарам або кіраўніком маёнтка.

У кнізе ўпершыню публікуюцца інвентары буйнога феадальнага ўладання Смаргонь, якое належала магнатам Зяновічам, а пазней — шырока вядомаму ў гісторыі Беларусі і Польшчы роду князяў Радзівілаў. Навізна гэтага выдання ў тым, што яна ўтрымлівае дзевяць параўнальных апісанняў адной і той жа латыфундыі ў розныя гады XVII—XVIII стагоддзяў, што дазваляе разгледзець у двухвекавой дынаміцы развіцця характэрныя рысы быту беларускай вёскі, эканамічнае і сацыяльнае становішча сялянства. Вялікае значэнне маюць матэрыялы інвентароў аб структуры феадальнай вотчыннай гаспадаркі.

Вялікую цікавасць выклікаюць даныя, якія дазваляюць прасачыць змены ва ўзроўні развіцця прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі і промыслаў, даходаў магнатаў, дапамагаюць даследчыку выявіць дэмаграфічныя зрухі гарадскога і сельскага насельніцтва на працягу двух стагоддзяў у феадальнай вотчыне.

Новае выданне Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР будзе вельмі карысным для даследчыкаў гісторыі Беларусі, выкладчыкаў ВНУ і сярэдніх школ, студэнтаў гістарычных, эканамічных і філалагічных факультэтаў, архіўных і музейных работнікаў, краязнаўцаў. Шмат цікавага змогуць узяць з публікуемых інвентароў пісьменнікі, мастакі і архітэктары.

Заказы накіроўваць па адрасу: 220038 Мінск, вул. Казлова, 26, ЦДГА БССР.

**А. ЦІТОЎ,**
**старшы навуковы**
**супрацоўнік.**

### МАСТАК ЖАРТУЕ



У час сесіі.

Мал. В. Асіпенкі.

**ПРАПАНУЕ ШТАБ ВЫХАДНОГА ДНЯ**

паглядзець кінафільм «Розыгрыш», які будзе дэманстравацца 29 мая ў актавай зале ўніверсітэта. Пачатак кінасеанса ў 20 гадзін.

**Спорт**

## У ФІНАЛ ВЫЙШЛІ ФУТБАЛІСТЫ

У Гомелі на стадыёне «Лакаматыў» праведзены заняльныя матчы па футболу на першынство Белсавета «Буравеснік». За дзве пуцёўкі ў фінал змагаліся каманды Беларускага інстытута народнай гаспадаркі, Мінскага тэхналагічнага інстытута, БПІ і яго Гомельскага філіяла, Магілёўскага педагагічнага і Гродзенскага медыцынскага інстытутаў і нашага ўніверсітэта.

Найбольш паспяхова выступілі ў турніры футбалісты ГДУ. Толькі адзін матч з камандай Гомельскага філіяла БПІ яны закончылі ўнічыю, а ва ўсіх астатніх сустрэчах дабіліся перамогі і выйшлі ў фінал, дзе працягнуць барацьбу за вышэйшыя ўзнагароды. Такога ж права дабіліся і гомельскія політэхнікі.

**У. ДЖОЕЎ,**
**трэнер каманды.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў выкладчыкаў і студэнтаў геалагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне в. а. загадчыка кафедры гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі МЯДЗВЕДЗЕВУ Льву Дзмітрыевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю маці.**

АЗ 05330

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў СССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём—1 друк. аркуш.
Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П. 4-8, т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 3702.